CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

KOD | PESEL

***Miejsce na naklejkę.***
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **E-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

DATA: **18 maja 2022 r.**
GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**
CZAS PRACY: **180 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **40**

**WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY**

Uprawnienia zdającego do:
☐ dostosowania zasad oceniania.

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 11 stron.
   Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
5. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
8. Możesz korzystać ze słowników językowych.

EMBB-R0-**100**-2205

Układ graficzny
© CKE 2021

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. На падставе фрагмента артыкула Настассі Панкратавай *Рэч у сабе* прадстаў тэму і паразважай над ёй. Карыстайся тэзісам і думкамі аўтаркі і звярніся да іншых тэкстаў культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Настасся Панкратава
***Рэч у сабе***

Тэатр можа быць інструментам для сацыяльных змяненняў. Зразумела, асобны калектыў татальна не паўплывае на працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве. І ўсё ж спектакль можа загучаць так, каб хаця б нейкая частка гледачоў змяніла погляд на рэальнасць і змагла адчуць важнасць праблем, пра якія гавораць са сцэны, выпрацавала сваё актыўнае стаўленне да гэтых болевых кропак паўсядзённасці. […]

Мне даводзілася неаднойчы задавацца пытаннем, навошта рэжысёр абірае да пастаноўкі пэўную тэму, якая, здаецца, ніякім чынам не суадносіцца са светаадчуваннем сучасных гледачоў. Прэм’ер у сталічных і не толькі афішах шмат, вось толькі далёка не ўсе даюць нагоду для развааг. Яшчэ менш – адгукаюцца на актуальныя тэмы, што паўсюдна, толькі не са сцэны, абмяркоўваюць людзі. І колькі б спецыялісты ні казалі, што нельга выводзіць на першы план адно забаўляльную функцыю, для шэрагу пастаноўшчыкаў тэатр працягвае быць рэччу ў сабе, існаванне якой ніяк не суадносіцца з жыццём па-за сценамі ўстановы.

Пры лішку легкаважных сюжэтаў у айчыннай мастацкай прасторы ўзнікае заканамернае пытанне: магчыма, тэатр – гэта не тая пляцоўка, дзе можна ўздымаць сур’ёзныя пытанні пра тут і зараз? Рэжысёрка Лабараторыі сацыяльнага тэатра Eclab Валянціна Мароз упэўнена: любую тэму можна вынесці на сцэну. Толькі ў кожным канкрэтным выпадку трэба знайсці спосаб, як пра гэта гаварыць.

– На мінулым тыдні ў нашай Лабараторыі адбылася прэм’ера, – распавядае рэжысёрка. – У спектаклі “Нам тут жыць” мы разважаем пра сацыяльную, матэрыяльную, гендарную і іншыя формы няроўнасці. Калі нашы акцёры распавялі пра будучую пастаноўку бацькам, то большасць з іх са здзіўленнем запыталася, а навошта пра гэта гаварыць. “У нас усё добра”, – рэфрэнам гучала ад дарослых людзей. Моладзь жа бачыць непрыемныя і нават непрымальныя[1] сацыяльныя працэсы, якія не даюць магчымасці нашаму грамадству развівацца. Навошта мы бяром такія складаныя тэмы? Бо нас гэта хвалюе.

Чаму нават прапанова паслухаць пра выпадкі дыскрымінацыі на працы, школьны булінг, эйджызм[2], матэрыяльную няроўнасць выклікае адкрытае непрыняцце? Чаму людзям прасцей у соты раз перажываць перыпетыі сямейных драм ці міждзяржаўныя калізіі ў папулярным серыяле, чым шчыра прызнацца сабе, што названыя вышэй праблемы існуюць і сутыкнуцца з імі можа кожны (калі ўжо сам не пабываў у скуры ахвяры)?

– Нават у акцёраў бывае супраціўленне на першым этапе абмеркавання будучага спектакля. Маўляў, навошта лезці ў складаную тэму. Зараз я разумею: калі людзі адмаўляюцца пра штосьці разважаць, то гэтыя паводзіны і выдаюць болевую кропку

[1] Непрымальны – такі, з якім нельга пагадзіцца.
[2] Эйджызм – дыскрымінацыя паводле ўзросту.

соцыуму, – дзеліцца назіраннямі акцёр Лабараторыі сацыяльнага тэатра Eclab Павел Андрэеў. – Гэткая рэакцыя ў нашых суразмоўцаў падчас нарыхтоўкі матэрыялу часцяком тлумачыцца тым, што некаторыя баяцца, што ўспаміны могуць выклікаць паўторнае перажыванне псіхалагічнай траўмы. І тут мы імкнёмся ўпэўніць суразмоўцу, што прагаворванне болевых пытанняў само па сабе не з'яўляецца траўматычным, аднак можа некаму сапраўды дапамагчы перажыць сваю няпростую сітуацыю.

Паводле Н. Панкратавай, *Рэч у сабе* [у:] www.kimpress.by

**Тэма 2. Зрабі параўнальны аналіз і інтэрпрэтацыю вершаў. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Ларыса Геніюш
***Хата***

Хата радзімая, хата старая,
што абаперлася ў садзе аб вішні,
стройна свой чуб саламяны ўбірае
голлем, вясною аквечаным, чыстым.

Ў поле бязмернае, поле далёкае,
ўбок, дзе палоскі шлях рассякае,
сумна глядзяць твае мілыя вочы,
быццам з дарогі каго выглядаюць.

Мохам пратканыя шэрыя сцены,
плот, што ля саду пастаўлены крыва,
ясна-шумлівай, квітнеючай пенай
буйная зелень вясёла прыкрыла.

Камень шырокі ляжыць ля парога,
гладкі, бліскучы, вітае так міла!
Безліч бяздомных з далёкай дарогі
тут каля хаты на ім адпачыла.

Пэўна, не раз ім матуля казала:
"Сядзь, папалудный, чужынча, ты з намі, –
роднага сына дзесь доля загнала,
можа, й яго хто пакорміць таксама.

Покуль жыву, сцерагу яго месца,
прыйдзе – пачэсна на покуце сядзе,
хатняе стравы нап'ецца, наесца,
колас наліты рукою пагладзіць.

Выйдзе на поле з баронкай і плугам,
ў ціхую хату прывабіць дзяўчыну,
кончыцца боль мой і злыя нядугі,

косці старыя пры іх адпачынуць.

Можа, спаткаеш? Такі цёмна-русы,
скажаш, матуля яго тут чакае.
Хай не забудзе сваёй Беларусі,
хай не зрачэцца радзімага краю...”

Л. Геніюш, *Хата* [у:] www.rv-blr.com

Францішак Багушэвіч
***Мая хата***

Бедна ж мая хатка расселася з краю,
Меж пяскоў, каменняў, ля самага гаю,
Ля самага бору, на беражку лесу;
Ніхто тут не трафе, хоць бы з інтарэсу.
Як няма гарэлкі, няма куска хлеба,
Дык які ж інтэрас, каму сюды трэба?
Да хоць няма хлеба, жабраваць не буду,
Пражыву як-кольвек ад працы, ад труду!

Кепска ж мая хатка, падваліна згніла,
І дымна, і зімна, а мне яна міла;
Не буду мяняцца хоць бы і на замкі, –
Калок свой мілейшы, як чужыя клямкі.
На страсе мох вырас, на маху бярозка.
Мільшая мне хатка, як чужая вёска.

Сваталі ж мне ў прыймы у новую хату,
На зямлю ражайну і дзеўку багату;
Буду жыць, казалі, як які пасэсар[3],
Ездзіць парай коні, як сам пан асэсар[4];
Да мне даражэйшы вугал гэты гнілы,
Камень пры дарозе, пясок ля магілы,
Як чужое поле, як дом мураваны! –

Не аддам за сурдут каптан свой падраны.
Клікалі ж у госці і клічуць суседзі –
Не пайду, не трэба, бо, кажуць, заедзі
Ад чужога хлеба губы абсядаюць,
Што чужога прагнуць, то сваё кідаюць.
Я не кіну хаты, хоць вы мяне рэжце,
Не пайду да вас я, хіба у арэшце.

А хоць сілай нават адарвалі б з дому,
Калісьці вярнуўся б, як мядзведзь да лому.
Заваліцца й хата, зарастуць пакосы,

[3] Пасэсар – арандатар.
[4] Асэсар – станавы прыстаў.

Усё б я вярнуўся, хоць голы да босы!
Насек бы бярвенняў, нацягаў бы моху,
Зноў бы склеціў хату як-кольвек патроху,
Зрабіў бы камору, выкаваў бы жорны, –
Усё ж свой хлеб еў бы, хоць бы сабе чорны!
Ну дык жа адстаньце, нашто я вам трэба:
Ці каб ваш хлеб есці, ці рабіць вам хлеба?

Ф. Багушэвіч, *Мая хата* [у:] www.knihi.com

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

………………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………………

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| wypowiedź argumentacyjna | A. | 0 – 3 – 6 – 9 | | |
| | B. | 0 – 3 – 6 – 9 | | |
| interpretacja porównawcza | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 2 | | |
| | D. | 0 – 3 – 6 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 2 – 4 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

# BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*